УДК 930.2(476)

# АНАЛІЗ КРЫНІЦ ПА ГІСТОРЫІ ГАНДЛЁВАГА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

***В. А. Карпіевіч,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Універсітэт грамадзянскай абароны
МНС Беларусі

*У артыкуле аналізуюцца крыніцы па гісторыі беларускага гандлёвага прадпрымальніцтва другой паловы XIX ст. Аўтар разглядае сярод архіўных і апублікаваных дакументаў некалькі груп крыніц: навуковыя публікацыі, статыстычную інфармацыю, перыядычныя матэрыялы, справаздачы кіраўнікоў рэгіёнаў, матэрыялы першага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі. Даследаваныя крыніцы дазваляюць глыбей зразумець узровень развіцця гандлёвай дзейнасці ў Беларусі другой паловы XIX ст.*

**Ключавыя словы**: крыніцы, гандаль, прадпрымальніцтва, купецтва, статыстычныя дадзеныя, звесткі, архівы, матэрыялы.

## Уводзіны

Другая палова XIX ст. вызначалася важнымі пераменамі, якія адбываліся як агульна ў Расійскай імперыі, так і на беларускіх землях. Буржуазныя рэформы сталі значным штуршком для развіцця новага грамадства, заснаванага на капіталістычных адносінах. У гэты перыяд менавіта прадпрымальніцкая дзейнасць стала прывабнай для прыкладання капіталаў. Пры гэтым менавіта гандлёвае прадпрымальніцтва атрымала значнае распаўсюджанне на беларускіх землях. Купецтва ў Беларусі стала адной з важнейшых катэгорый насельніцтва, на базе якога пачало ўзнікаць важнейшае саслоўе капіталістычнага грамадства – прадпрымальнікі. Пры вывучэнні названай праблемы важнае значэнне адыгрываюць разнастайныя крыніцы.

## Асноўная частка

У дасавецкі перыяд былі асобныя спробы разгледзець пытанне аб эканамічным развіцці беларускіх губерняў, уключаючы пытанне і аб развіцці гандлёвага прадпрымальніцтва. Рознабаковы матэрыял па дадзенай праблеме можна знайсці ў працах, якія былі складзены афіцэрамі генеральнага штаба [1–4]. Самай цікавай і змястоўнай з'яўляецца праца П.О. Баброўскага, які спрабуе даць разгорнуты аналіз стану развіцця гандлю ў беларускіх губернях у сярэдзіне XIX ст. Аднак ён памылкова прагназаваў, што будаўніцтва чыгунак не палепшыць становішча ўнутранага і знешняга гандлю, і памылкова сцвярджаў, што сродкі неабходна ўкладваць у развіццё водных шляхоў.

Цікавая інфармацыя сабрана ў працы Ю. Янсона "Пинск и его район" [5]. Аўтар, дацэнт імператарскага Пецярбургскага ўніверсітэта, быў удзельнікам экспедыцыі імператарскага вольнага эканамічнага і рускага геаграфічнага таварыства па вывучэнні хлебнага гандлю і вытворчасці ў Расіі. Ю. Янсон падрабязна апісаў гандлёвую дзейнасць у г. Пінску, падкрэсліў яго значэнне ў якасці важнага гандлёвага і транзітнага цэнтра на поўдні Беларусі. Аўтар справядліва сцвярджаў, што дасканала вызначыць абарот хлебнага гандлю ў Пінску немагчыма, таму што дадзеныя збіраюцца са слоў гандляроў.

Цікавасць выклікае праца М. Раеўскага "Западный район экспедиции по изучению хлебной торговли и производительности России" [6]. Аўтар сабраў шматлікі матэрыял па рэгіёне Заходняй Дзвіны і вярхоўя Дняпра. Ён падрабязна апісаў шляхі дастаўкі хлеба ў рэгіён і паказаў значэнне рэк, у першую чаргу Заходняй Дзвіны, у гандлі хлебам і льном. Таксама цікавасць выклікае апісанне заняткаў сялян, асабліва Магілёўскай губерні. Аднак, нягледзячы на наяўнасць значнага статыстычнага матэрыялу, да дадзенай працы неабходна ставіцца крытычна, таму што аўтар не засяроджваў увагу на вывучэнні менавіта беларускіх губерняў. А вывучаны ім рэгіён ахопліваў таксама і вялікую колькасць расійскіх паветаў.

Ролю водных і чыгуначных шляхоў зносін у развіцці гандлю (і ў першую чаргу – знешняга) разглядаў А. Сапуноў [7]. Ён прааналізаваў вываз хлебных і льняных грузаў за апошнія 30 гг. XIX ст. па Заход-

© Карпіевіч В. А. , 2018

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

няй Дзвіне і па Рыга-Арлоўскай чыгунцы з часу яе адкрыцця. А. Сапуноў падрабязна ахарактарызаваў тыя працэсы, якія ўплывалі на адпраўку грузаў па рацэ і чыгунцы.

Спробу падрабязна асвяціць развіццё гандлёвага прадпрымальніцтва ў Магілёўскай губерні распачаў А.С. Дэмбавецкі [8]. У выдадзенай пад яго рэдакцыяй трохтомнай працы ў другой кнізе ўсебакова разглядаецца пытанне развіцця гандлю ў губерні.

У працы А.П. Субоціна [9] значная ўвага ўдзяляецца складу гандлёвага саслоўя ў Беларусі ў канцы XIX ст. Аўтар паказвае значную ролю яўрэйскага насельніцтва ў гандлёвай дзейнасці ў Беларусі. Пры гэтым адзначаецца, што канкурэнцыя сярод іх узрастае. З другога боку, назіраецца адноснае павелічэнне гільдзейскіх гандляроў-неяўрэяў.

Важнай крыніцай для вывучэння праблемы развіцця гандлю з'яўляюцца архіўныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Мінску і Нацыянальнага гістарычнага архіва ў г. Гродна.

У фондах канцылярый грамадзянскіх губернатараў (ф. 295 – Мінскага, ф. 1430 – Віцебскага, ф. 2001 – Магілёўскага) змешчаны звесткі пра галоўныя кірмашы губерняў, а таксама справаздачы за пэўныя гады. У фондах канцылярый грамадскіх губернатараў змяшчаецца вялікі аб'ём матэрыялаў, якія тычацца колькасці гарадскіх жыхароў па саслоўях, звесткі аб падатках, спісы прамысловых прадпрыемстваў. У фондах гарадскіх упраў (ф. 1 – Мінскай, ф. 611 – Пінскай, ф. 2099 – Магілёўскай, ф. 2496 – Віцебскай, ф. 2523 – Полацкай) маюцца звесткі аб колькасці выдадзеных пасведчанняў на права гандлю.

У фондах губернскіх статыстычных камітэтаў (ф. 21 – Мінскім, ф. 2187 – Магілёўскім, ф. 2502 – Віцебскім) змешчаны разнастайныя звесткі, якія тычацца развіцця гандлёвай дзейнасці ў губернях, у тым ліку абароты кірмашоў, колькасць выдадзеных пасведчанняў на права гандлю, вываз грузаў па рэках і чыгунках і іншыя статыстычныя звесткі. У фондзе Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта таксама змешчаны асобныя звесткі, якія тычацца Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў.

У фондах казённых палат (ф. 333 – Мінскай, ф. 2157 – Магілёўскай) і падатковых інспекцый (ф. 358 – Мінскай, ф. 360 – Бабруйскай, ф. 359 – Слуцкай, ф. 2520 – Полацкай, ф. 2781 – Віцебскай) маюцца звесткі пра гандлёвую дзейнасць у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях. Такія ж звесткі па Гродзенскай губерні ўзяты з фонду Гродзенскага губернскага статыстычнага камітэта (ф. 14), фонду канцылярыі гродзенскага губернатара (ф. 1), фонду Гродзенскай казённай палаты (ф. 24).

Цікавыя звесткі, якія тычацца развіцця гандлёвага прадпрымальніцтва ў Беларусі ў другой палове XIX ст., змешчаны ў перыядычных выданнях таго часу. Да іх ліку можна аднесці Памятныя кніжкі Віленскага, Віцебскага, Гродзенскага, Магілёўскага і Мінскага губернатараў, Памятнай кніжцы Віленскага генерал-губернатара, Агляды Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. У іх змешчаны разнастайныя звесткі пра кірмашы, колькасць выдадзеных пасведчанняў на права гандлю, грузазвароты па рэках і чыгунках, а таксама звесткі пра вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі, фабрычную вытворчасць, колькасць насельніцтва і інш.

Асобныя звесткі пра гандлёвую дзейнасць змяшчаюць такія перыядычныя выданні, як "Адрес-календарь Виленского генерал-губернатора", "Вестник Западной России", "Виленский календарь", а таксама "Приложения к всеподдайнейшему отчету" губернатараў. Тут можна атрымаць звесткі пра купцоў, кірмашы, выдадзеныя пасведчанні на права займацца гандлёвай дзейнасцю.

У асобныя гады выдаваліся ў якасці дадаткаў да губернскіх ведамасцяў статыстычныя і даведачныя табліцы, у якіх змяшчаюцца разнастайныя матэрыялы, у тым ліку і тыя, якія тычацца развіцця гандлю. У другой палове XIX ст. таксама выдаваліся дадаткі да статыстычнага зборніка Міністэрства шляхоў зносін.

Важнымі крыніцамі, якія змяшчаюць дадзеныя пра гандлёвую дзейнасць, з'яўляюцца статыстычныя зборнікі. Да іх адносяцца "Статистический временник Российской империи", які выдаваўся з 1866 па 1890 г. у трох серыях. З 1887 па

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1917 г. выдавалася “Статистика Российской империи” ў 94-х тамах. Матэрыялы, якія тычацца перавозак розных грузаў па рэках і чыгунках, змешчаны ў “Статистическом сборнике МПС”, якіх было выдадзена з 1877 па 1916 г. 139 выпускаў.

З 1888 па 1903 г. выдаваўся “Временник Центрального статистического комитета МВД”. Усяго было выдадзена 53 нумары, некаторыя з якіх непасрэдна тычыліся гандлю. Найбольш буйным і падрабязным выданнем, якое змяшчае матэрыялы аб гандлі, з’яўляецца “Вестник финансов, промышленности и торговли”. Ён выходзіў з 1865 па 1917 г. У “Весніку” можна знайсці разнастайную інфармацыю, якая ахоплівае ўсе бакі гандлёва-прамысловай дзейнасці, у тым ліку і фінансы.

У 1870 г. былі выдадзены “Труды Минского губернского статистического комитета”, якія, па сутнасці, з’яўляюцца гісторыка-статыстычным апісаннем 9 паветаў Мінскай губерні. У дадзенай працы змяшчаюцца падрабязныя звесткі пра заняткі насельніцтва па паветах. Асобная ўвага нададзена развіццю гандлёвай дзейнасці жыхароў губерні. Аднак звесткі збіраліся ў асноўным са слоў вытворцаў альбо гандляроў, а яны, безумоўна, давалі заніжаныя дадзеныя [10].

З 1888 па 1900 г выдаваліся “Статистические результаты процентного и раскладочного сборов за 1885–1896/98 гг.” і “Свод данных о торговых сборах в России за 1884–1897/98 гг.” У гэтых выданнях змяшчаліся звесткі пра колькасць гандлёвых і прамысловых прадпрыемстваў, пра іх класіфікацыю па відах гандлёвай і прамысловай дзейнасці. Тут можна атрымаць дакладныя звесткі пра гандлёвы абарот і гадавы прыбытак прадпрыемстваў, а таксама кошт раскладачнага збору і працэнт абкладання. Да 1889 г. раскладачны збор плацілі толькі гільдзейскія прадпрыемствы, а з гэтага года быў уведзены дадатковы падатак і для негільдзейскіх прадпрыемстваў. А гэта значыць, што з’явіліся дадзеныя і па прадпрыемствах, якія гандлявалі па пасведчаннях на дробны гандаль і промыслы. Пры гэтым дадзеныя, якія выходзілі да 1890 г уключна, змешчаны ў павятовым разрэзе, а ў наступных выпусках – толькі ў цэлым па губерні.

Пэўную цікавасць выклікаюць асобныя выданні, якія публікаваліся ў розных частках імперыі і змяшчалі дадзеныя пра арганізацыю і ажыццяўленне гандлёвага прадпрымальніцтва, у тым ліку і ў беларускіх губернях. У другой палове XIX ст. публікуюцца разнастайныя дакументы, падрыхтаваныя рознымі дзяржаўнымі ўстановамі. Пэўныя матэрыялы, якія ўтрымліваюць звесткі пра прамысловую і гандлёвую дзейнасць, змешчаны ў зборніку “Статистическое описание Виленского военного округа по отраслям промышленности, имеющим значение для интендантского ведомства” [11].

Сярод іншых прац можна выдзеліць такія, як “О географическом распределении государственных доходов и расходов в России. Опыт финансово-статистического исследования” М.П. Яснапольскага і Дадатак да даследавання М.П. Яснапольскага “О географическом распределении государственных доходов и расходов в России”, а таксама працу “Экономическое состояние городских поселений Европейской России в 1861–1862 гг.” Названыя выданні змяшчаюць цікавыя звесткі пра дзейнасць розных прадпрыемстваў, у тым ліку і тых, якія займаліся гандлем. У працы пра гарадскія паселішчы сабраны звесткі пра колькасць жыхароў, іх заняткі, пра арганізацыю і асаблівасці гандлёвага прадпрымальніцтва [12–14].

Некаторыя даныя пра гандлёвае прадпрымальніцтва змешчаны ва ўказальніку, які быў складзены П.А. Арловым па афіцыйных звестках Дэпартамента гандлю і мануфактур за 1879 г. У выданне ўвайшлі дадзеныя пра фабрыкі і заводы, пра якія ёсць афіцыйныя звесткі і сума вытворчасцей якіх не менш за 2 тыс. руб. Прадпрыемствы ва ўказальніку размешчаны па відах вытворчасцей і размеркаваны па губернях. У дадзеным выданні паказаны ўладальнікі і іх сацыяльнае становішча. Указальнік дае звесткі пра купецкія прадпрыемствы [15].

Значнай працай, якая тычыцца асвячэння гандлёвай дзейнасці, з’яўляецца “Торговля и промышленность Европейской России по регионам”, выдадзеная напачатку XX ст. пад рэдакцыяй С. Цянь-Шанскага. У ёй падрабязна разглядаецца вываз асноўных тавараў па групах у іншыя рэгіёны Расійскай імперыі і за мяжу, а таксама ўвоз тавараў гэтых жа груп у рэгіён.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Аднак аўтары пры ўкладанні названай працы ўлічвалі не адміністрацыйны падзел на губерні, а склалі сабраныя звесткі з пункту погляду геаграфічнага становішча тэрыторый. Таму большая частка тэрыторыі сучаснай Беларусі ўвайшла ў склад Палескай паласы. Аднак сюды ж быў далучаны і шэраг паветаў Валынскай губерні. У той жа час уся тэрыторыя Віцебскай губерні, частка Магілёўская і Дзісненскі павет Віленскай губерні ўвайшлі ў склад Паўночна-Заходняй земляробчай паласы [16].

Цікавыя звесткі пра склад насельніцтва змешчаны ў матэрыялах, якія тычацца першага агульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі, які праводзіўся ў 1897 г. Напачатку ХХ ст. яго матэрыялы былі выдадзены пад рэдакцыяй Н.А. Трайніцкага ў 89 тамах. З іх пяць тамоў тычыліся непасрэдна беларускіх губерняў: т. IV змяшчае дадзеныя па Віленскай губерні, т. V – па Віцебскай, т. XI – па Гродзенскай, т. XXII – па Мінскай і т. XXIII – па Магілёўскай [17]. Матэрыялы перапісу змяшчаюць не толькі агульныя дадзеныя пра колькасць жыхароў у гарадах і паветах. У азначаным выданні можна знайсці дакладныя звесткі пра колькасць купецкага саслоўя, а таксама колькасць насельніцтва, якое займалася гандлёвай дзейнасцю, у тым ліку развазным і разносным гандлем, пасрэдніцтвам, працавала ў крэдытных і камерцыйных установах. І хоць падчас публікацыі матэрыялаў дакладнасць атрыманых звестак ставілася пад сумненне, тым не менш параўнанне звестак перапісу насельніцтва з матэрыяламі земскіх падворных перапісаў і адміністрацыйна-паліцэйскіх падлікаў паказвае разыходжанне ва ўліку насельніцтва ў цэлым усяго на некалькі працэнтаў, што сведчыць пра высокую дакладнасць матэрыялаў перапісу насельніцтва наогул.

**Заключэнне**

Неабходна адзначыць, што ў дасавецкі час спецыяльных прац, прысвечаных развіццю гандлёвага прадпрымальніцтва ў Беларусі, не існавала. Названыя вышэй працы закраналі толькі асобныя аспекты, прычым яны разглядаліся толькі ў сувязі з эканамічным развіццём Расійскай імперыі ў цэлым. Пры гэтым неабходна крытычна ставіцца і да саміх звестак пра гандлёва-прамысловую дзейнасць, таму што дадзеныя, што змяшчаліся ў афіцыйных справаздачах, свядома скажаліся. Таму ўсе матэрыялы і статыстычныя дадзеныя неабходна апрацоўваць не толькі матэматычна, але і рабіць параўнальны аналіз.

***СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ***


1. ***Бобровский, П.*** Физические и нравственные элементы северо-западных губерний России / П. Бобровский // Вестник Западной России. – Вильно : Тип. штаба Виленского воен. округа, 1866. Т. II. Кн. VI. – С. 49–69.
2. ***Бобровский, П.*** Гроденская губерния / П. Бобровский. – СПб., 1863.
3. ***Зеленский, И.*** Минская губерния / И. Зеленский. – СПб., 1864.
4. ***Корев, А.*** Виленская губерния / А. Корев. – СПб., 1861.
5. ***Янсон, Ю. Э.*** Пинск и его район / Ю. Э. Янсон. – СПб. : Тип. В. Безобразцова, 1869. – 179 с.
6. ***Раевский, И.*** Западный район экспедиции по изучению хлебной торговли и производительности России / И. Раевский. Ч. 2 : Район Западной Двины и верховьев Днепра. – СПб. : Тип. бр. Пантелеевых, 1876. – 168 с.
7. ***Сапунов, А.*** Река Западная Двина / А. Сапунов. – Витебск : Тип. Г. Малкина, 1893. – 512 с.
8. Опыт описания Могилёвской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях : в 3 кн. / под ред. А. С. Дембовецкого. – Могилев : Тип. губ. правл., 1884. Кн. 2. – 1000, [4] с.
9. ***Субботин, А. П.*** В черте еврейской аседлости / А. П. Субботин. – Вып. 1 : Минск, Вильна, Ковна и их районы. – СПб. : Изд. ред. экономического ж-ла, 1888. – 148 с.
10. Историко-статистическое описание 9 уездов Минской губернии // Труды Минского губернского статистического комитета. Вып. 1. – Минск, 1870. – 436 с.
11. Статистическое описание Виленского военного округа по отраслям промышленности, имеющим значение для интендантского ведомства. – СПб., 1876. – 96, IV с., 7 л. табл.
12. ***Яснопольский, Н. П.*** О географическом распределении государственных доходов и расходов в России. Опыт финансово-стат. исследования Н. П. Яснопольского / Н. П. Яснопольский. – Киев :


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Тип. императорского ун-та св. Владимира, Киевское отд. т-ва печ. дела и торг. И. И. Кушнерев и К., 1890. Ч. 1. – 236 с.
13. Приложение к исследованию Н.П. Яснопольского "О географическом распределении государственных доходов и расходов в России". – Киев : Тип. ун-та св. Владимира, В. И. Завадзкого, 1897. – 13 с. ; 72 табл.
14. Экономическое состояние городских поселений Европейской России в 1861–1862 гг. – СПб. : Тип. Вульфа, 1863. Т. 1. Отд. 4. Виленская губ. – 24 с.; Отд. 5. Витебская губ. – 33 с.; Отд. 10. Гродненская губ. – 58 с.; Отд. 11. Минская губ. – 30 с.; Отд. 20. Могилевская губ. – 33 с.
15. ***Орлов, П. А.*** Указатель фабрик и заводов / П. А. Орлов. – СПб. : Тип. братьев Пантелеевых, 1881. – 753 с.
16. Торговля и промышленность Европейской России по районам : в 12 вып. – СПб. : Тип. В. Киршбаума, 1901. Вып. 2 : Северо-Западная земледельческая полоса. – 324 с. ; Вып. 11 : Полесская зона. – 86 с.
17. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого. Т. IV. Виленская губерния. – СПб., 1901 ; Тетрадь 2. – СПб., 1904. Тетрадь 3; Т. V : Витебская губерния. – СПб., 1899. Тетрадь 1; – СПб., 1903. Тетрадь 3 ; Т. XI. Гродненская губерния. – СПб., 1904; Т. XXII. Минская губерния. – СПб., 1904; Т. XXIII. Могилевская губерния. – СПб., 1903.

Паступіў у рэдакцыю 17.03.2018 г.
Кантакты: karpievich68@yandex.by
(Карпіевіч Віктар Аляксандравіч)

**Karpiyevich V. THE ANALYSIS OF THE SOURCES ON THE HISTORY OF TRADING BUSINESS IN BELARUS IN THE SECOND HALF OF THE XIX CENTURY.**

*The author analyses the sources on the history of trading business in Belarus in the second half of the nineteenth century. Considering archival and published documents he investigates several groups of sources: scientific publications, statistical information, periodicals, regional leaders' reports, the materials of the first population census of the Russian Empire. These sources help to understand the development level of trade activities in Belarus in the second half of the nineteenth century.*

**Keywords:** sources, trade, trading business, merchants, statistical data, information, archives, materials.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова